Трэці квартал 2024 года адзначыўся мноствам падзей. У гэты перыяд бібліятэкі раёна адзначылі юбілейныя і знамянальныя даты каляндара, праводзілі мерапрыемствы ў рамках Года Якасці, 80-годдзя ўтварэння Гродзенскай вобласці. У перыяд летніх канікулаў актыўна супрацоўнічалі з дзіцячымі лагерамі. Шмат увагі ўдзялялася рабоце па выхаванню здаровага ладу жыцця, праводзіліся мерапрыемствы ў рамках экалагічнага, ідэалагічнага, сямейнага выхавання.

## Святло друкаванага слова (мерапрыемствы да Дня беларускай пісьменнасці)



У інтэграванай бібліятэцы аграгарадка Дэмбрава прайшло гістарычнае падарожжа «Гісторыя кнігадрукавання ў Беларусі». Наведвальнікі мерапрыемства даведаліся шмат цікавых фактаў з гісторыі беларускага пісьменства і кнігадрукавання, даведаліся, дзе і калі ўзніклі і якімі былі першыя друкарні і першыя друкаваныя кнігі.

Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка правяла



бібліяквест "Да вытокаў кніжнасці". Дзеці даведаліся шмат цікавага пра выдатных беларускіх асветнікаў, пазнаёміліся з традыцыяй святкавання друкаванага слова.

Шчучынская дзіцячая бібліятэка запрасіла членаў аматарскага аб'яднання "Натхненне" на чарговае пасяджэнне пад назвай "Беларускае слова гучыць у стагоддзях".



## 80-годдзе Гродзенскай вобласці



У рамках святкавання 80-годдзя ўтварэння Гродзенскай вобласці ў Шчучынскай дзіцячай бібліятэцы быў праведзены віртуальны часопіс "Гродзеншчына: гады здзяйсненняў". У ходзе мерапрыемства дзеці ўспомнілі гісторыю вобласці, даведаліся аб знакамітых асобах, якія ўнеслі свой уклад у развіццё Грдзеншчыны.

6 верасня Васілішкаўская сельская бібліятэка запрасіла юных чытачоў на гадзіну гісторыі “Дзень нараджэння нашай зямлі", Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі - старшакласнікаў ДУА "Сярэдняя школа №1 г. Шчучына" на гістарычны дайджэст "Гродзеншчына ў прасторы і часе". Супрацоўнікі аддзела бібліятэчнага маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і





метадычнай работы прапанавалі чытачам Ражанкаўскай інтэграванай бібліятэкі адправіцца ў віртуальнае падарожжа "Дарагі мне да болю край".



У інтэграванай бібліятэцы аграгарадка Дэмбрава прайшоў краязнаўчы экскурс «Вехі гісторыі Гродзенскага краю». У ходзе



мерапрыемства прысутныя даведаліся, як за гісторыю свайго існавання Гродзенская вобласць ператварылася ў развіты прамысловы комплекс з развітой сельскай гаспадаркай і высокімі дасягненнямі ў развіцці сацыяльнай і культурнай сферы. Пры дапамозе электроннай прэзентацыі пазнаёміліся са славутасцямі Гродзенскай вобласці.

У Астрынскай гарпасялковай бібліятэцы прайшла квэст-гульня "Ганарымся табой, Гродзеншчына!". Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка запрасіла школьнікаў у краязнаўчае падарожжа “Гродзенская вобласць – месца дзеянняў і пераўтварэнняў”. У Навадворскай сельскай бібліятэцы адбыўся





гістарычны экскурс “Гродзеншчына: мінулае і сучаснасць" Ракавіцкая сельская бібліятэка прапанавала сваім чытачам краязнаўчае падарожжа "Край мой-гонар мой".

## 80-годдзе вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў



4 ліпеня ў Астрынскай гарпасялковай бібліятэцы прайшоў патрыятычны дыялог “Нізкі паклон за вызваленне!”, ў Тур'янскай сельскай бібліятэцы прайшла гадзіна ваеннай кнігі “Памяць пра вайну нам кніга пакідае”. Бібліятэкар расказала пра гераічныя старонкі Вялікай Айчыннай вайны, пра вялікую цану заваяванай Перамогі, пра подзвіг дзяцей у ваенны час.





У Жалудоцкай гарпасялковай бібліятэцы адбыўся гістарычны альманах "Раскажы мне пра вайну".

12 ліпеня Васілішкаўская сельская бібліятэка запрасіла дзяцей на гадзіну гісторыі “Светлы вобраз Беларусі”. У Астрынскай гарпасялковай бібліятэцы прайшла вечарына памяці “Нізкі паклон за вызваленне!”. Гістарычныя дадзеныя, успаміны, матэрыялы, сабраныя за шмат гадоў, відэа - усё гэта выкарыстоўвалася падчас сустрэчы. Кожны з удзельнікаў расказаў нешта з гісторыі сваёй сям'і, звязанае з ваенным лёсам блізкіх людзей.





Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка правяла гістарычную гадзіну «Раскажы мне пра вайну», Бакштаўская сельская бібліятэка запрасіла чытачоў на гістарычны экскурс “Вайны святыя старонкі назаўжды ў памяці людзей”.

## Да Дня народнага адзінства



15 верасня ў Навадворскай сельскай бібліятэцы адбылася гістарычная замалёўка “У адзінстве – сіла Беларусі”. У ходзе мерапрыемства, чытачы даведаліся пра гісторыю вяртання спрадвечных заходніх зямель Беларусі. Выказалі меркаванне аб гістарычным значэнні ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР. Пазнаёміліся з выставай “Беларусь - краіна адзінства”.



17 верасня ў Васілішкаўскай сельскай бібліятэцы прайшло пасяджэнне аматарскага аб'яднання “Сямейная акадэмія” на тэму “Разам мы сіла”.

Супрацоўнікі аддзела абслугоўвання і інфармацыі Шчучынскай раённай бібліятэкі імя Цёткі афармілі кніжную выставу "Беларусь. Радзіма. Адзінства" да ўрачыстага мерапрыемства да Дня народнага адзінства, якія прайшоў у Шчучынскім цэнтры культуры і народнай творчасці.





У Шчучынскай дзіцячай бібліятэцы для чытачоў была падрыхтавана відэахроніка "Калі мы разам - мы сіла".

Астрынская гарпасялковая бібліятэка правяла для выхаванцаў дзіцячага сада гульнявую праграму “Адзіная Беларусь - адзіны народ”. Дзеці пачулі кароткі аповед пра падзеі ў Беларусі ў 1939 годзе, паглядзелі прэзентацыю «Зямлі маёй мінулы лес», з задавальненнем слухалі вершы.



18 верасня супрацоўнікі аддзела маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы Шчучынскай раённай бібліятэкі правялі гадзіну талерантнасці "У нас адзіная Радзіма - у нас адзіная сям'я", Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка запрасіла дзяцей у паэтычна-пазнавальнае падарожжа “Я тут жыву”.





20 верасня супрацоўнікі аддзела маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы правялі ў Ражанкаўскай інтэграванай бібліятэцы гадзіну патрыятызму “У нас адзіная Радзіма - у нас адзіная сям'я”.

## Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь

2 ліпеня ў інтэграванай бібліятэцы аграгарадка Дэмбрава адбылося віртуальнае падарожжа "Свабодная і



прыгожая Беларусь". Юныя ўдзельнікі разам з бібліятэкарам адправіліся ў анлайн-падарожжа па знакавых мясцінах нашай краіны.



2 ліпеня Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі запрасіла дзяцей з летняга аздараўленчага лагера "#Тэрыторыя_дзяцінства" ДУА "Сярэдняя школа №2 г. Шчучына" на літаратурна-тэматычную праграму "Любуюся табой, мая Беларусь!". Заданні да тэматычных блокаў "Беларусь ад "А" да "Я", "Што зараз Беларуссю завецца?", "Я ведаю пра цябе ўсё", "Шчасце жыць у роднай краіне!" былі цікавымі і пазнавальнымі.



3 ліпеня Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі арганізавала патрыятычную пляцоўку "Дзень памяці, дзень гонару, Дзень Незалежнасці". Асаблівую цікавасць у жыхароў горада выклікала экспазіцыя пошукавага праекта "Экспедыцыя памяці". Для самых маленькіх жыхароў была падрыхтавана інтэрактыўная дзіцячая пляцоўка "Мы – будучыня Беларусі". Дзеці разам з бацькамі прымалі актыўны ўдзел у віктарынах і гульнях: "Падарожжа ў краіну Незалежнасці", "Традыцыі Беларусі", "Збяры герб".



4 ліпеня ў Ракавіцкай сельскай бібліятэцы прайшоў конкурс малюнкаў "Роднай краіне прысвячаецца".

# Літаратурныя юбілеі

## *да 148-годдзя з дня нараджэння Алаізы Пашкевіч*



14 ліпеня Навадворская сельская бібліятэка запрасіла сваіх чытачоў на літаратурную хвілінку "Зорка беларускай паэзіі", прысвечаную 148-годдзю з дня нараджэння Алаізы Пашкевіч. Падчас мерапрыемства ўдзельнікі пазнаёміліся з асноўнымі вехамі жыцця і творчасці паэткі, пагарталі зборнікі яе твораў, паглядзелі прэзентацыю "Алаіза Пашкевіч (Цётка)".



19 ліпеня ў Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі адбылося чарговае пасяджэнне літаратурна-музычнай гасцёўні "Ад усёй душы" пад назвай "А мары Цётчыны жывуць". На сустрэчы гучалі творы Цёткі, вершы іншых беларускіх паэтак. Пасля мерапрыемства ўдзельнікі сустрэчы ўсклалі кветкі да помніка Цёткі.



20 ліпеня да 148-годдзя з дня нараджэння Алаізы Пашкевіч Астрынская гарпасялковая бібліятэка правяла літаратурную старонку "Пад зоркай Алаізы", якая добра ўплялася ў свята "У госці да Алаізы". Запрошаныя госці чыталі вершы пра Беларусь, расказвалі пра сябе і захапляліся святам, а бібліятэцы падарылі свае кнігі.

Падчас “Свабоднага мікрафона” бібліятэкар запрасіла пачытаць усіх ахвочых вершы любімых паэтаў. Пасля госці знаёміліся з выставамі, адказвалі на пытанні прысутных.

### *да 100-годдзя з дня нараджэння Артура Вольскага*



24 верасня інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава правяла літаратурны аўтограф “Шчодрыя россыпы дабрыні”, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння Артура Вольскага. У ходзе мерапрыемства ўдзельнікі пазнаёміліся з цікавымі фактамі з жыцця пісьменніка, паглядзелі слайд-прэзентацыю пра творчасць пісьменніка, пазнаёміліся з кнігамі аўтара, паўдзельнічалі ў віктарыне па яго творах.

25 верасня бібліятэкары Астрынскай гарпасялковай бібліятэкі правялі ўрок у музеі “Дзядзька Артут кліча ў падарожжа”. Удзельнікі мерапрыемства пачулі цікавы аповяд пра пісьменніка і кнігі, чыталі яго вершы.

### ***да 65-годдзя В.І. Русілкі***



21 ліпеня ў Бакштаўскай сельскай бібліятэцы прайшла літаратурная старонка “Гэта я – над высокім абрывам” да 65-годдзя нашай зямлячкі, Вольгі Іванаўны Русілкі, якая знаёма па такіх паэтычных зборніках: “Табе”, “Ажына”, “В.І.Р.”, “Сцежка, сцежачка, сцяжынка”. пачалася яе творчасць. Яе паэзія напоўнена любоўю да роднага краю, У гэты

дзень чыталіся вершы "Ажына", "Бершты", "Вяртанне", "Дом" і многія іншыя.

У Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі прайшло пасяджэнне літаратурна-музычнай гасцёўні “Ад усёй душы” пад назвай “Літаратурныя вандроўкі з Вольгай Русілкай”. На мерапрыемстве чыталіся яе вершы аб Берштах, месцы прыцяжэння душы паэтэсы. Прагучалі “Берштаўскія прымавіскі”, якія выклікалі цікавасць і ўсмешкі ўдзельнікаў мерапрыемства.

## Акцыя летняга чытання “Большая перемена”



4 ліпеня мультсалон "Як кніжка фільмам стала і на экран патрапіла" зноў сабраў сваіх юных чытачоў у Навадворскай сельскай бібліятэцы. Мультсалон быў прысвечаны казкам-падарожжам. Дзеці пазнаёміліся з казкамі, у якіх героі падарожнічаюць, у тэхніцы арыгамі склалі самалёцікі і паглядзелі мультфільм «Зачараваны хлопчык» паводле казкі С. Лагерлёф «Цудоўнае падарожжа Нільса з дзікімі гусямі».



6 ліпеня ў Навадворскай сельскай бібліятэцы прайшла паэтычная гадзіна “Бацькаўшчына пад блакітнымі нябёсамі”. Чытачы пазнаёміліся з паэзіяй сучасных беларускіх паэтаў: Ірынай Войтка, Валерыя Максімовіча, Людмілы Кебіч і паэта-зямляка Генрыха Тарасевіча. На мерапрыемстве гучалі іх вершы пра Беларусь, пра родны край.



7 ліпеня Ракавіцкая сельская бібліятэка сустрэла сваіх чытачоў на бібліядворыку “Пачытай-ка”. Усе з задавальненнем маглі пачытаць любімыя казкі, вершы на свежым паветры, пазнаёміцца з новым паступленнем літаратуры. Для юных чытачоў былі падрыхтаваны розныя гульні і конкурсы.

11 ліпеня Навадворская сельская бібліятэка сабрала юных чытачоў у мультсалон "Як кніжка фільмам стала і на экран патрапіла". Самымі любімымі кніжнымі і мульцяшнымі героямі ў дзяцей аказаліся кот Леапольд і кот Том, а таксама мышаняты з гэтых мультфільмаў.



21 ліпеня Тур'янская сельская бібліятэка запрасіла дзяцей цікава і пазнавальна правесці свой вольны час на кніжную паляну "Дзяўчынкі і хлапчукі чытаюць летам кніжкі". Бібліятэкар пазнаёміла дзяцей з навінкамі літаратуры, запрашаючы іх да актыўнага чытання. Юныя чытачы прынялі актыўны ўдзел у гульні-віктарыне "Харавод казак", конкурсе "Літаратурная мазайка".




25 ліпеня Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка запрасіла дзяцей у літаратурнае падарожжа "Пачытай сам – парай сябрам!". Шчучынская дзіцячая бібліятэка арганізавала бібліялужайку “Летам з кнігай праводзім час”. Мэтай гэтага праекта стала папулярызацыя чытання

сярод юных чытачоў. Для іх была падрыхтавана літаратурна-гульнявая праграма "Пагуляем - пачытаем". Тут яны не толькі маглі абмеркаваць любімых кніжных герояў, але і паўдзельнічаць у вясёлых гульнях на свежым паветры.



У Ракавіцкай сельскай бібліятэцы 15 жніўня прайшоў літаратурны вернісаж "Дзіўных казак свет нябачны". Разам з бібліятэкарам дзеці з задавальненнем падарожнічалі па любімых дзіцячых казках. Вымаўлялі чароўныя словы-загаворы, каб выканаліся жаданні. З чатырохрадкоўяў адгадвалі назву казак. Пагулялі ў гульню "Пытанне - адказ", "Казачны перапалох".

17 жніўня Бакштаўская сельская бібліятэка запрасіла юных чытачоў на віктарыну "Жыла-была казка". Дзеці адказвалі на пытанні віктарыны, даведваліся казачных герояў па апісанні, разгадвалі сканворды і адгадвалі загадкі. У заключэнне глядзелі мультфільм "Казка аб залатым пеўніку".



17 жніўня Навадворская сельская бібліятэка запрасіла юных чытачоў на гадзіну цікавых адкрыццяў "Цікавыя сакрэты кніжнага лета". Школьнікі пазнаёміліся з кнігамі пра лета і пра летнія прыгоды, паўдзельнічалі ў вясёлай віктарыне «Летняя прыгода», падзяліліся самымі яркімі падзеямі лета, а таксама паспрабавалі сябе ў ролі мастака, малюючы летнія сюжэты.

18 жніўня Тур'янская сельская бібліятэка запрасіла рабятаў цікава і пазнавальна правесці свой вольны час на

бібліятэчны пікнік “Лета! Лета! Азары нас яркім святлом!». У праграме мерапрыемства былі вясёлыя літаратурныя конкурсы, творчыя заданні, пытанні на кемлівасць. Дзеці ўзгадвалі любімыя дзіцячыя вершы, адгадвалі загадкі і адказвалі на галоўнае пытанне "Якога колеру лета?".



19 жніўня ў Шчучынскай дзіцячай бібліятэцы прайшло пасяджэнне аматарскага аб'яднання “Натхненне” пад назвай “Літаратурныя імёны: Памэла Трэверс”, якое было прымеркавана да 125-годдзя з дня нараджэння англійскай пісьменніцы. Для удзельнікаў зрабілі агляд самых знакавых твораў.

## Дзень бібліятэк



Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка запрасіла вучняў 1-4 класаў на гістарычны экскурс "Бібліятэка сустракае, у свет кнігі запрашае". Дзеці актыўна прымалі ўдзел у конкурсах і віктарынах, з якіх даведаліся структуру кнігі, Правілы карыстання бібліятэкай, цікавыя факты з гісторыі бібліятэк. Таксама дзеці паказалі свае веды ў літаратурнай віктарыне "Казачная сцяжынка" і "Пішу вершы сам".

У Ракавіцкай сельскай бібліятэцы прайшоў святочны вечар “Бібліятэка збірае сяброў”.





15 верасня работнікі Астрынскай гарпасялковай бібліятэкі разам са сваімі  лепшымі чытачамі адзначылі Дзень бібліятэк і 80-годдзе сваёй бібліятэкі. Гучала шмат вершаў, музычных уставак. Столькі добрых слоў і пажаданняў пачулі бібліятэкары, што атрымалі натхненне на многія месяцы. Шмат пажаданняў і віншаванняў атрымалі бібліятэкары і бібліятэка ад сваіх сацыяльных партнёраў. Жанчыны на хвіліну ператвараліся ў акцёраў тэатра, успаміналі свае першыя наведвання бібліятэкі і свае любімыя кнігі, казалі пра вельмі добразычлівай атмасферы ў бібліятэцы.



У рамках святкавання Дня бібліятэк у Шчучынскай дзіцячай бібліятэцы працавала біблія-кафэ “Пра кнігу з любоўю”. Наведвальнікам мерапрыемства было прапанавана кніжнае меню. Удзельнікі мерапрыемства з задавальненнем адгадвалі загадкі, шукалі адпаведнасць літар імёнах герояў казкі, збіралі прыказкі і прымаўкі.

21 верасня ў інтэграванай бібліятэцы аграгарадка



Дэмбрава адбылося пасяджэнне жаночага клуба “Берагіня” на тэму “Бібліятэка працуе для вас!”. Бібліятэкар распавяла цікавыя факты пра бібліятэкі, і пра сузор'е найвялікшых імёнаў - прадстаўнікоў бібліятэчнай

справы. На працягу ўсяго мерапрыемства гучалі вершы і песні пра бібліятэку, жанчыны адказвалі на пытанні літаратурнай віктарыны і прынялі ўдзел у конкурсе «самая разумная».

## Выхаванне здаровага ладу жыцця



14 ліпеня ў Жалудокскай гарпасялковай бібліятэцы прайшло пасяджэнне аматарскага аб'яднання “Бяседа” на тэму “Лекавыя расліны”. Удзельнікі мерапрыемства пазнаёміліся з гаючымі ўласцівасцямі лекавых раслін, з іх разнастайнасцю, з некаторымі правіламі збору, сушкі, захоўвання і прымянення. Даведаліся аб лекавых раслінах, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення, і рэдкіх відах, унесеных у Чырвоную кнігу, якія знаходзяцца пад аховай дзяржавы.

24 ліпеня на бібліярандэву “Бібліятэка – тэрыторыя без межаў” супрацоўнікі Шчучынскай раённай бібліятэкі імя Цёткі прапанавалі землякам і гасцям горада пазнаёміцца з выставай “Кнігі на службе здароўя”. Увазе дапытлівых былі прапанаваны матэрыялы аб некаторых хваробах, аб народных сродках іх лячэння, аб прафілактыцы і здаровым ладзе жыцця. Усе жадаючыя змаглі стаць чытачамі бібліятэкі і ўзяць з сабой кнігі і часопісы на тэмы, якія іх цікавяць.



7 ліпеня ў інтэграванай бібліятэцы аграгарадка Дэмбрава прайшла гадзіна жывых зносін "Старонкі цвярозасці, або чытанне на кожны дзень". Мэта мерапрыемства – прафілактыка дзіцячага алкагалізму, ахова здароўя дзяцей, прывіццё ім негатыўнага стаўлення да п'янства і іншых згубных звычак.

12 ліпеня ў Навадворскай сельскай бібліятэцы для дарослых чытачоў прайшла гутарка "Доза маленькая - бяда вялікая". Удзельнікі мерапрыемства пазнаёміліся са звесткамі статыстыкі па ўчыненні злачынстваў і правапарушэнняў у стане алкагольнага ап'янення па Гродзенскай вобласці і Рэспубліцы Беларусь у цэлым. Мерапрыемства накіравана на фарміраванне ва ўдзельнікаў больш адказных адносін да ўласнага здароўя і здароўя блізкіх, а таксама разумення неабходнасці актыўнай падтрымкі дзяржаўнай палітыкі па прафілактыцы алкагалізму ў грамадстве.

## Фарміраванне інфармацыйнай культуры



5 ліпеня супрацоўнікі Шчучынскай раённай бібліятэкі імя Цёткі наведалі Шчучынскую філіял ААТ “Малочны Мір”. Работнікі прадпрыемства пазнаёміліся з выданнямі з фонду бібліятэкі. Кожны знайшоў для сябе карыснае і цікавае. Пакінулі заяўкі на кнігі, якія забяруць у жніўні. Супрацоўніцтва з прадпрыемствам працягваецца.

Бібліятэкар А.У. Гайдукевіч